РЭСПУБЛІКАНСКІ ТВОРЧЫ ФОРУМ
**ВЫЦІНАЕМ РАЗАМ**
МАЛАДЗЕЧНА

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар УА “Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М.К.Агінскага”
Дз.А.Рауба________________________
“____” ________________202_3_ г.

ПАЛАЖЭННЕ
аб арганізацыі і правядзенні
III Рэспубліканскага творчага форуму “Выцінаем разам”

## 1.АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Сапраўднае палажэнне вызначае парадак арганізацыі, падрыхтоўкі і правядзення Рэспубліканскага творчага форуму “Выцінаем разам” (далей- Форум).

1.2 Арганізатар Форуму– цыклавая камісія “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” УА “Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М.К.Агінскага”.

1.3 Форум праводзіцца пры падтрымцы Мінскага абласнога цэнтра народнай творцасці, Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці.

1.4 Для непасрэднага кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем Форуму ствараецца арганізацыйны камітэт (далей-аргкамітэт).

1.5 Аргкамітэт ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва за падрыхтоўкай і правядзеннем Форуму.

1.6 Інфармацыя аб правядзенні Форуму размяшчаецца не пазнй 2-х месяцаў да пачатку правядзення Форуму на афіцыйным сайце **molmk.by** УА “Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М.К.Агінскага” і іншых сацыяльных сетках Інтэрнэту.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ФОРУМУ

2.1 Мэтамі Форуму з'яўляюцца :
аб'яднанне майстроў выцінанкі з розных куткоў Беларусі;
знаёмства з новымі імёнамі;
падтрымка пачынаючых майстроў;
абмен педагагічным і прафесійным вопытам.

2.2 Задачы Форуму:
папулярызацыя мастацтва выразання з паперы;
зберажэнне традыцый і асаблівасцей беларускай выцінанкі;
прыцягнуць увагу моладзі да народнага мастацтва выцінанкі;
стымуляванне маладых аўтараў да далейшай творчай дзейнасці.

## 3. УМОВЫ ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ФОРУМЕ

3.1 Да ўдзелу ў Форуме запрашаюцца майстры і аматары выцінанкі ва ўзросце ад 18 гадоў, настаўнікі ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (цэнтры (палацы), дзіцячыя школы мастацтваў), супрацоўнікі і навучэнцы ўстаноў культуры і адукацыі (каледжы, гімназіі-каледжы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, цэнтры народнай творчасці і інш.).

3.2 Для ўдзелу ў Форуме неабходна да 2 чэрвеня 2023 года адправіць заяўку і анкету- апытанне па электроннай пошце на адрас dpi_molmk@mail.ru (гл. Дадатак 1,2).

3.3 Кожны ўдзельнік Форуму павінен па магчымасці падрыхтаваць творчыя работы (4-5 выцінанак) для часовай выставы ( памер не больш 40х60см., без афармлення, у файлах) .

3.4 Удзельнікі павінны мець з сабой неабходныя матэрыялы і інструменты для творчага выразання.

3.5 Удзельнікі Форуму маюць магчымасць засяліцца ў інтэрнат, можна замовіць комплексны абед у кафэ каледжа.

3.6 Пражыванне ў інтэрнаце каледжа ў перыяд правядзення Форуму, харчаванне і дарожныя выдаткі за кошт удзельніка.

## 4. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ФОРУМУ

4.1 Рэспубліканскі творчы Форум "Выцінаем разам" будзе праходіць 16-17 чэрвеня 2023 года на базе УА "Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М.К.Агінскага" .

4.2 Для правядзення Форуму распрацавана праграма мерапрыемстваў.

4.3 У рамках Форуму адбудуцца даклады, абмеркаванні і разважанні па пытаннях мастацкага выразання, майстар-класы, часовая выстава творчых работ удзельнікаў.

4.3 Па заканчэнні Форуму ўсе ўдзельнікі атрымаюць сертыфікаты.

4.4 Азнаёміцца з праграмай Форуму можна на сайце www.molmk.by.

Адрас і кантакты: 222310 г. Маладзечна, вуліца Вялікі Гасцінец, 52
**dpi_molmk@mail.ru**

+375296138322 –Валковіч-Борыс Людміла Мікалаеўна
volckovich-boris@yandex.by

+375296976176 – Чырвонцава Лізавета Львоўна
lizavetaChe@yandex.ru